STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 6, ROK 2006

*Анна Саковіч*
*Беласток*

# Некаторыя асаблівасці празаічных мініяцюр Яна Чыквіна

Малая лірычная проза набыла асаблівую папулярнасць сярод беларускіх літаратараў у XX стагоддзі. Мабыць, гэтая форма з яе разняволенай мастацкаю структураю, монацэнтрычнасцю выказвання найлепшым чынам адпавядае патрэбам і магчымасцям самавыяўлення творчай асобы ў супярэчлівы час сацыяльна-грамадскіх катаклізмаў, сусветных войн, навукова-тэхнічнага прагрэсу з яго непрадказальнымі, нечаканымі, часта трагічнымі наступствамі.

З'яўленне празаічнай мініяцюры або "верша ў прозе" спачатку ў рускай літаратуры, а затым і ў беларускай, звязваецца з агульнаеўрапейскай практыкай перакладу лірычных вершаў прозай. У французскай традыцыі пачынальнікам гэтай формы малой літаратуры прынята лічыць Эварыста Парні, які пасля наведання Мадагаскара напісаў вершы ў прозе, змешчаныя ў кнізе *Мадэгаскія песні* (1787). Увогуле ж у французскай літаратуры XIX стагоддзя заўважаецца шмат прыхільнікаў гэтай формы: гэта і Алоізіюс Бяртран (*Гаспар з цемры* 1842), і Шарль Бадлер (*Парыжскі сплін* 1869), і Арцюр Рэмбо (*Азарэнні, Сезон у пекле* 1872–1873), якога прынята лічыць французскім класікам новага жанру. Рускі пісьменнік Іван Сяргеевіч Тургенеў, які шмат гадоў пражыў у Францыі, відаць, менавіта пад уплывам заходнееўрапейскай традыцыі напісаў вершы ў прозе *Senilia* (*Старческое*). Якраз ён лічыцца пачынальнікам і майстрам гэтага жанру ў рускай літаратуры XIX стагоддзя. Цікава, што вызначэнне жанру, які замацаваўся за стракатымі па складу мініяцюрамі ў прозе Тургенева – малымі апавяданнейкамі, лірычнымі замалёўкамі, драматычнымі

сцэнкамі – са згоды пісьменніка даў выдавец часопіса "Вестник Европы", якому Тургенеў даслаў гэтыя свае творы з Францыі напачатку 1880-х гадоў пазамінулага стагоддзя.

У беларускай літаратуры першаю і вельмі ўдалаю спробай, можна сказаць, узорам для наступнікаў у гэтай творчай сферы сталі *Абразкі* Змітрака Бядулі (1913 год), аднаго з выдатнейшых пачынальнікаў навейшай беларускай літаратуры. Пісьменнікам з чулай і паэтычнай душой назваў яго Максім Багдановіч. Вядомая даследчыца творчасці З. Бядулі Зоя Мельнікава падкрэслівае, што *"Абразкі" – гарманічныя і натуральныя для экспрэсіўна-рамантычнага стылю ранняй творчасці Бядулі і ўсёй маладой беларускай літаратуры*[1]. Тым жа пачаткам, які аб'ядноўвае розныя па змесце лірычныя імпрэсіі, стала цэласная сістэма філасофска-эстэтычных поглядаў асобы, *якая пакутуе ад дысанансаў жыцця, але настойліва шукае гармонію і шчасце ў гэтым няўтульным свеце*[2].

Адным з заснавальнікаў традыцыі беларускай празаічнай мініяцюры з'яўляецца Максім Гарэцкі. Кароткая, малая лірычная форма была актуальнаю для пісьменніка на працягу ўсяго яго творчага шляху: ад мініяцюр ранняй пары *Буйніцы і драбніцы, Усё мінаецца, Стогны душы* да цыклу *Сібірскія абразкі*, *Люстрадзёна* і ўрэшце *Скарбаў жыцця*, *Лявоніуса Задуменкуса*, *Кіпарысаў* у апошні трагічны жыццёвы перыяд. Міхась Мушынскі слушна адзначае:

> У *Скарбах...* Максіма Гарэцкага шмат ад філасофскай прытчы, ад алегорыі, ад шчырай пісьменніцкай споведзі, усхваляванага мастакоўскага маналогу, ад жанру прарочага казання, прадбачання, якім чалавек пачынае валодаць у экстрэмальнай, пагранічнай сітуацыі, у хвіліны асабліва напружанага інтэлектуальнага жыцця. Менавіта ў такім крытычным становішчы і аказаўся на пачатку 30-х гадоў М. Гарэцкі[3].

*Скарбы жыцця* Максіма Гарэцкага пісаліся ў 1932–1935 гадах, а пабачылі свет толькі напрыканцы XX стагоддзя. Яны засведчылі, што традыцыя беларускай лірычнай прозы не занікала і ў варожых чалавечай душы сацыяльна-грамадскіх абставінах. Хоць, зразумела, вельмі шкада, што гэтыя творы не маглі доўгі час аказваць уплыў на літаратурны працэс, як і ўся "рэпрасаваная" творчасць М. Гарэцкага.

---

[1] З. П. Мельнікава, *"На горне душы..." Творчасць Змітрака Бядулі і беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя*, Брэст 2001, с. 40.

[2] Тамсама.

[3] *Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя ў чатырох тамах*, Мінск 1999, т. I, с. 423.

Найбольш вопытным майстрам жанру лірычнай прозы ў сучаснай беларускай літаратуры з'яўляецца Янка Брыль[4]. Аўтар адзінага ў беларускай літаратуры лірычнага рамана такога кшталту *Птушкі і гнёзды* (1964), выдатны майстар апавядання пачынае з 70-х гадоў мінулага стагоддзя аддаваць выразную перавагу жанру лірычнай мініяцюры. Алесь Яскевіч пранікліва заўважыў, што літаратурная грамадскасць разглядала спачатку лірычныя запісы Я. Брыля як дапаможны матэрыял да вялікага эпічнага палатна аб сучаснасці.

> Але ў плане творчым форма замалёвак непасрэдных уражанняў з натуры, іх сузіральна-лірычнага перажывання, паводле назапашвання пісьменніцкага вопыту патрабавала ўмацоўвання ў сваіх жанравых правах. І думаецца, што гэтай улюбёнай празаікам форме лірычнага самавыяўлення, якую аўтар не іначыць ужо на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў, наканавана сцвердзіцца ў нашай прозе самастойнай жанравай разнавіднасцю[5].

З поўным правам можна канстатаваць, што мініяцюра Я. Брыля заняла сваё вартае месца ў жанравай структуры беларускага прыгожага пісьменства, стала пэўным узорам, эталонам для прадстаўнікоў наступных творчых пакаленняў. Больш таго, разглядаецца як *цэлы этап эвалюцыі жанравых асаблівасцей і мастацкіх магчымасцей малых празаічных твораў*[6].

Мініяцюра як жанр месціцца на памежжы лірыкі і эпікі, што, пэўна ж, дадаткова ўзбагачае яго вобразна-выяўленчую сістэму. І адначасова, зразумела, ускладняецца ягоная жанравая характарыстыка: вельмі цяжка ўлічыць шматстайныя аспекты гэтай літаратурнай формы, якая *принадлежит словно бы двум культурам и традициям – стихотворной и прозаической – одновременно, поэтому может использовать приемы, мотивы, сюжэты и образы стихов и прозы, порой причудливо и прихотливо монтируя их в рамках одного произведения или цикла. Характерно, что стихотворения в прозе обычно пишутся и печатаются именно циклами или целыми книгами*[7]. Бясспрэчна, сваім

---

[4] Я. Брыль, *Жменя сонечных промняў* 1965, *Вітражы* 1972, *Свае старонкі* 1951 1979, *Сёння і памяць* 1985, *Пішу як жыву* 1994, *Вячэрняе* 1994 і інш.

[5] А. С. Яскевіч, *Ритмическая организация художественного текста*, Минск 1991, с. 123.

[6] Р. К. Казлоўскі, *Беларуская празаічная мініяцюра XX стагоддзя*. Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук, Мінск 2002, с. 3.

[7] Ю. Орлицкий, *Стих и проза в русской литературе*, Москва 2002, с. 221.

знешнім выглядам лірычная мініяцюра напамінае асаблівага роду прозу, лірычным жа сваім бокам набліжаецца да белага верша або верлібра, якому ўласціва схільнасць да філасафічнасці, унутранай напружанасці, вобразнай структурнай скандэнсаванасці, асацыятыўнасці. Таму, напрыклад, верлібр Максіма Багдановіча *Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы* (1915), як і яго ж апавяданні *Музыка* (1907) і *Апокрыф* (1913), некаторыя даследчыкі лічаць набліжанымі да лірычнай мініяцюры.

Бясспрэчнай увагі заслугоўвае тут лапідарная характарыстыка складанай жанравай формы, зробленая Русланам Казлоўскім:

> Празаічная мініяцюра – асобны жанр у беларускай літаратуры XX стагоддзя, які характарызуецца наступным комплексам устойлівых прыкмет, што з'яўляюцца дамінуючымі і вызначаюць фармальна-сутнасную арганізацыю мастацкіх твораў: невялікі аб'ём, свабодная кампазіцыя, бессюжэтнасць, суб'ектыўнасць, выразнасць мастацка-выяўленчых сродкаў пры моцнай насычанасці ідэйна-філасофскім зместам, а таксама спалучэнне асаблівасцей эсэістычнага стылю. Паводле сэнсавых уласцівасей у сваім змесце ўтрымлівае імгненны фрагмент (малюнак) рэчаіснасці, думкі[8].

На тое, што не заўсёды ўдаецца дакладна вызначыць жанр твора, мяжу паміж мініяцюрай і кароткай эсэістыкай, звяртае ўвагу і Ганна Кісліцына:

> Невялікі аб'ём, канкрэтная тэма, суб'ектыўнасць, вольная кампазіцыя, схільнасць да парадоксаў, арыентацыя на размоўную мову – гэтыя і іншыя прыкметы эсэістыкі адначасова з'яўляюцца вызначальнымі і для лірычнай мініяцюры, паняцця, якое традыцыйна ўжываецца ў беларускай літаратуры замест запазычанага – эсэ[9].

Для жанру мініяцюры ўласціва, каб аповед вёўся пісьменнікам ад першай асобы. Хоць, трэба заўважыць, што гэта не абавязковае запатрабаванне, чаму класічным прыкладам вершы ў прозе І. С. Тургенева.

Аб пашырэнні аб'ёму паняцця мініяцюра сведчыць той факт, што сярод твораў, якія адносяцца да гэтага ж жанру, можна ўбачыць розныя мінімальныя формы: паэтычную рэфлексію ў прозе, прытчу, дыялог, імпрэсію, версет, абразок, лірычную замалёўку, кароткія

[8] Р. К. Казлоўскі, *Беларуская празаічная мініяцюра XX стагоддзя*, с. 3.

[9] Г. М. Кісліцына, *Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры*, Мінск 2000, с. 27.

дзённікавыя запісы, аб'яднаныя ў цыклы, алегорыю і г. д. Усё гэта сведчыць аб вялікіх патэнцыях мініяцюры, дзе паэт–пісьменнік можа ў сваіх выказванннях вызваліцца ад традыцыйных законаў вершаскладання, якія канкрэтнымі патрабаваннямі да формы абмяжоўваюць яго творчае самавыяўленне.

Творчасць Яна Чыквіна як аўтара паэтычных зборнікаў *Іду* (1969), *Святая студня* (1970), *Неспакой* (1977), *Na progu świata* (1983), *Сонечная вязь* (1988), *Кругавая чара* (1989), *Odpoczynek przy wyschnię-tym źródle* (1996) *Свет першы і апошні* (1997), *Крэйдавае кола* (2002) даследавалася і аналізуецца ў разнастайных аспектах. У Інстытуце Літаратуры Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі ў 2000 годзе была абаронена і кандыдацкая (доктарская) дысертацыя, прысвечаная паэзіі Я. Чыквіна. Празаічная ж творчасць шматгадовага старшыні літаратурнага аб'яднання "Белавежа" да гэтай пары застаецца недаследаванай.

Можна сказаць, што кожны пісьменнік, які напісаў хаця б адзін цыкл твораў малой прозы, стварае ўласную жанравую мадэль гэтай формы. Яну Чыквіну ўласцівы схільнасць да філасафічнасці і рэфлексіі, устаноўка на медытатыўнасць, інтэлектуальную заглыбленасць. У цэнтры яго мініяцюр разнастайныя праявы жыцця чалавека, яго радасць, шчасце, а таксама расчараванне, скруха. Пісьменнік адлюстраваў і ў гэтых творах, як і ў паэтычных, свой душэўны, накоплены гадамі вопыт, пеWhile ражытае, пачутае, пабачанае.

Мініяцюры Яна Чыквіна былі напісаны ў 1976–1977 гадах, а пабачылі свет толькі праз 22 гады ў часопісе "Тэрмапілы" пад назваю *Трохкрылыя птушкі* пад псеўданімам Янка Дубіцкі. Між іншым, адным з першых псеўданімаў паэта.

Метафарычнай з'яўляецца сама назва цыкла, які пачынаецца і заканчваецца творамі, у якіх птушка набыла ці не ключавы сэнс. Гэтая маленькая істота ўспрымаецца як памкненні душы ў пошуках праўды, як сімвал жыцця чалавека з яго шчасцем, болем, горыччу. Здаецца, што птушка ў палёце мае больш, чым два крылы. Асабліва датычыцца гэта лёту малых птушак. Іхнія крыльцы нібы займаюць сабой цэлую прастору. Сапраўды, птушка ў палёце – штосьці зменлівае, трапяткое, кранальнае. Дарэчы, гэты сімвал своеасабліва, па-свойму перадае і характар разглядаемага жанру. Мініяцюра ж таксама існуе паміж лірыкай і прозай – у працэсе іхняга судакранання, таемнага сімбіёзу. У нас жа, насельнікаў хрысціянскай экумены, могуць узнікнуць і асацыяцыі з сакральным зместам, з біблейнай лічбай "тры". Адна ж з Асоб Святой Тройцы – Святы Дух падаецца іканапісцамі ў выглядзе птушкі.

Сапраўды, сэнсавая поліфанічнасць назвы цыкла ўяўляецца складаным ключом для разумення ўсяго твора.

Цыкл мініяцюр *Трохкрылыя птушкі* складаецца з пяцідзесяці пяці твораў, розных па аб'ёму, спосабу мастацкага самавыяўлення, сярод якіх можна выдзеліць некалькі галоўных тэм. Тэм-праблем, якія часта ўзаемадзейнічаюць, перасякаюцца, але выступаюць, можна сказаць, у адной іпастасі: экзістэнцыя, сэнс жыцця чалавека, непасрэдны жыццёвы вопыт пісьменніка, адносіны з іншымі людзьмі, вобразы жанчын, прырода... Трэба адзначыць, што часта месцам дзеяння мініяцюр з'яўляецца Санкт-Пецярбург, на той час Ленінград, дзе ў 1976–1977 гадах Я. Чыквін доўгі час жыў, што таксама з'яўляецца дадатковым сведчаннем аўтабіяграфічнасці *Трохкрылых птушак*. Можна сказаць, што ў гэтым творы *лірычны герой (які, дарэчы амаль заўсёды – двайнік свайго аўтара) становіцца структурным цэнтрам усёй кампазіцыі, якая ўяўляе сабой ланцуг непасрэдных перажыванняў героя*[10].

Мініяцюры Я. Чыквіна характарызуюцца заглыбленасцю ў еўрапейскі культуралагічны і філасофскі кантэкст, што таксама ў значнай ступені пацвярджае іх аўтабіяграфічнасць, сведчаць аб шырокіх філалагічных інтарэсах аўтара. Ён, аўтар *Трохкрылых птушак*, часта звяртаецца да выказванняў вядомых пісьменнікаў, у прыватнасці: Вісарыёна Бялінскага, Андрэ Маруа, Джорджа Байрана, Іагана Вольфганга Гётэ, Івана Тургенева, Ярослава Івашкевіча, Станіслава Граховяка, ці да звестак з біяграфіі Аляксандра Пушкіна, Фёдара Дастаеўскага, або да герояў іх твораў, як напрыклад, Макара Дзевушкіна, Алёшы Карамазава.

Важнае месца ў мініяцюрах Я. Чыквіна займаюць назіранні за глыбіннымі праявамі жыцця, выяўленыя крытычным вокам пісьменніка-паэта. У шматлікіх філасофскіх роздумах уздымаецца пытанне пра тое, як найбольш вартасна пражыць адзін раз дадзены чалавеку зямны шлях. Пісьменніка страшыць *нястрымнае імкненне ў будучыню. Да чаго вядзе яно? Да перакрэслення жыцця нашых бацькоў і матак. Да згоды на іх смерць. Да маўклівай згоды на смерць многіх пакаленняў, як сродка для шчасця будучых пакаленняў. Амаральна!*[11] Гэтымі словамі Я. Чыквін нагадвае аб праміnанні, абмежаванасці чалавечага жыцця. Чалавеку ўласціва спяшацца за прагрэсам, цывілізацыяй, мроіць аб цудах, якія чакаюць яго дзесь за чарговым паваротам часу. Але ж

[10] Г. М. Кісліцына, *Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры*, с. 28.

[11] Я. Дубіцкі, *Трохкрылыя птушкі*, (у:) Тэрмапілы № 2, Беласток 1999, с. 85. (Далей старонкі падаюцца ў дужках)

там, за гэтым паваротам, ужо незнаёмыя, чужыя людзі. І няма сродку, каб прыручыць праміманне, рассунуць межы жыцця...

Вынікам унутранай рэфлексіі аказваюцца глыбокія высновы, роздумы над індывідуальнай працягласцю часу і залежнасцю яго ад спосабу жыцця. *Чалавек, калі жыве сярод другіх людзей і іх спраў, жыве вельмі хутка. А той, хто здалёку ад чалавечай мітусні – мае пачуццё працягласці часу і датыкання вечнасці* (86). Назіранне пісьменніка над асаблівасцямі плыні часу змушае чытача ўгледзецца ў сваё ўласнае жыццё. Усведамляйма сабе, што жыццё вельмі кароткае і таму добра было б скрозь насычаць яго мудрым зместам. Памятайма пра незваротнасць адведзенага нам часу, каб старацца пражыць яго найбольш вартасна, інтэнсіўна, умець радавацца цяперашняму, аддаваць належнае кожнаму дню, кожнаму імгненню.

Выразна медытатыўны характар маюць у *Трохкрылых птушках* фрагменты з вобразамі могілак (ці то ў Ленінградзе, ці то ў Дубічах Царкоўных). Лірычны герой шчыра прызнаецца, што раней баяўся кранаць магільныя крыжы. Вось цяпер жа не адчувае страху. Ён пераступіў *нейкі псіхічны бар'ер* (83) і можа ў *агародзе памерлых* (83) ўдыхаць *арамат жыцця і смерці* (83). У выніку ўнутранай эвалюцыі, узбагачэння жыццёвым вопытам памяняліся адносіны лірычнага героя да смерці. Мяжа паміж жыццём і смерцю перасунулася, што сведчыць аб працэсе ўзрастання, сталення душы.

Гэтыя роздумы Я. Чыквіна над сутнасцю быцця ўвогуле і асабістага жыцця наводзяць паралельна на думку, што творчасць з'яўляецца своеасаблівым сродкам неўміручасці для чалавека. Каб змястоўна, важка пражыць жыццё, трэба прасякнуцца яго нацыянальнай і агульначалавечай патэнцыяй.

Значнае месца ў мініяцюрах Я. Чыквіна займае вобраз прыроды, што далёка не выпадкова, бо вырас мастак сярод цудоўных краявідаў. Ян Чыквін нарадзіўся 18 мая 1940 года ў падбелавежскай вёсцы Дубічы Царкоўныя на Гайнаўшчыне. У гэтай вёсцы прайшло першых дзесяць гадоў жыцця паэта. Ён сам у інтэрв'ю, дадзеным Тэрэзе Занеўскай, прызнаўся, што гэты час здаецца яму найшчаслівейшай парою яго жыцця:

> Mieszkałem na wsi, w Dubiczach Cerkiewnych, niedaleko Puszczy Białowieskiej, do której nieraz chodziło się po jagody lub jesienią po orzechy, dziesięć moich pierwszych lat. Dzisiaj, z odległej perspektywy, wydają mi się one utraconą Arkadią, najszczęśliwszą porą mego życia[12].

---

[12] T. Zaniewska, *A dusza jest na wschodzie*, Białystok 1993, s. 28.

І менавіта дзяцінства ў Дубічах Царкоўных, як кажа ён сам, ёсць найчысцейшай крыніцай творчага натхнення паэта. Вобраз прыроды знаходзіць лірычнае ўвасабленне то ў вобразе птушак, то ў вобліку дрэў, якія *лісцём стотысячным са мной чытаюць* (82). Прыгожая, жывая прырода хавае ў сабе таямніцу жыцця.

Звяртае на сябе ўвагу ў цыкле Я. Чыквіна рэфлексія І. Тургенева пра птушак. *Маладых салаўёў трэба да старых падвешваць, каб вучыліся. І наглядаць: калі малады, пакуль стары спявае, сядзіць і маўчыць – слухае, з такога будзе талковы пясняр...*[13] Чаму ўвёў яе ў свой твор "белавежац"? Відаць, назіранне гэта ў значнай ступені адпавядае перакананням самога аўтара, як паэта.

Надыходзіць момант, калі душа шукае падтрымкі і не можа атрымаць яе ў знешнім, сярод штодзённых людскіх клопатаў. І лірычны герой *Трохкрылых птушак* прыходзіць у Нікольскі сабор Ленінграда. *З хаты няма звестак. Ад знаёмых – таксама. Радня, пасля апошняй сустрэчы, крыва глядзіць на мяне* (85). Са шчырасцю прызнаецца: *Я ўнутрана выплакаўся і бязбожна памаліўся* (77). Адбываецца пераацэнка жыццёвых каштоўнасцей. Сямідзесятыя гады, гэта значыць час напісання *Трохкрылых птушак*, былі дастаткова складанымі для хрысціянскай прасторы. Ды людзі насуперак афіцыяльнай палітыцы ўлад звярталіся са сваімі просьбамі да Бога, ішлі ў храм.

Адносіны да Бога, народная этыка, мараль прадстаўлены таксама і ў іншай мініяцюры. Лірычны герой прыходзіць да высновы, што хрысціяне, з аднаго боку, верацъ у Бога, і, адначасна, баяцца ўвесці ў гнеў *таго, чый смех знішчае фізічна і душэўна – усё!* (83), а з другога боку, даўнія паганскія забабоны надалей жывыя ў народнай традыцыі. Згодна з гэтай псіхалогіяй *людзі апавядаюць сумныя, трагічныя гісторыі, скардзяцца на сваё жыццё,...* (83), забываюцца аб тым, што без Яго дазволу волас з нашай галавы не спадзе.

У *Трохкрылых птушках* выступае сукупнасць жаночых вобразаў. Менавіта жанчыны, як прызнаўся ў інтэрв'ю Т. Занеўскай сам аўтар, з'яўляюцца другой крыніцай паэтычнага натхнення Я. Чыквіна. Гэтая тэма – таксама своеасаблівая кантынуацыя, пастаянны зварот да агульначалавечых праблем і "адвечных" тэм. Праніклівы лірычны герой назірае за жыццём жанчын, за драматычнымі яго праявамі. Вобраз за вобразам, што прадстаўлены ў шэрагу мініяцюр, урэшце стварае галерэю складаных чалавечых лёсаў, няшчасцяў, якія ча-

[13] Тамсама, с. 85.

каюць чалавека на жыццёвай дарозе. Тут і воблікі Наташы з Данецка, якая супрацiўляецца мужняй агрэсіі, Валі Рассэт – разумнай жанчыны, надзеленай багатым жыццёвым вопытам, Надзеі фон Мэкк, якая цэлае жыццё платанічна кахала Пятра Чайкоўскага. Узнікае пытанне пра прынцып адбору пісьменнікам жыццёвага матэрыялу. Відавочна, у дзявочых, ці мацярынскіх вобразах уражвае лірычнага героя іх бескарыслівасць, жаночая патрэба жыць для іншых. Жанчыны з мініяцюр Я. Чыквіна надзелены высокімі маральнымі якасцямі.

Уражвае таямнічае заканчэнне заключна-завяршальнай мініяцюры цыклу Я. Чыквіна: *І сёння ноччу, калі быў дарэшты змучаны фізічна, напружаны нярвова, з архіва памяці выплыў колішні час, з яго непрадбачанымі гукамі... Я прачнуўся раптоўна. Як тады, са стукатам сэрца да болю. І ў вачах з трохкрылымі птушкамі.* (87)

Жанр гэтай апошняй мініяцюры, своеасаблівага заключнага акорду, можна вызначыць як верлібр. Назіраецца тут перамяшчэнне розных часавых адрэзкаў у невялікім па аб'ёме матэрыялу. Такое вар'іраванне часам, сутыкненне розных часавых пластоў лічыцца адметнасцю мініяцюры і мае падкрэсліць *мэтанакіраванае, свядомае змяшэнне пабытавага, хуткаплыннага і высокага, філасафічнага, паняційнага*[14].

Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што мініяцюра з'яўляецца жанрам творчых асоб сталага ўзросту. Да яе прыходзяць маючы ўжо за сабой літаратурны, жыццёвы вопыт. Прыкметна, што ў малой форме лірычнай прозы вельмі добра адчуваюць сябе якраз паэты, што і пацвярджаюць *Трохкрылыя птушкі* Яна Чыквіна.

## STRESZCZENIE

W niniejszym artykule zwraca się szczególną uwagę na specyfikę gatunku lirycznej miniatury. Po raz pierwszy jest rozpatrywany cykl prozaicznych miniatur Jana Czykwina napisany w latach 1976–1977. Podkreśla się, iż Jan Czykwin tworzy swój własny model gatunkowy tej formy, dla którego właściwe jest zagłębienie w kwestie egzystencjalne, filozoficzność, szeroki ogólnoeuropejski kontekst kulturalny.

---

[14] Г. М. Кісліцына, *Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры*, с. 32.